Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# ЗБОР ЗАКОНАЎ І ЗАГАДАЎ

Рабоча-Сялянскага Ураду Беларускае Социялістычнае Савецкае Рэспублікі.

# СОБРАНИЕ ЗАКОНОВ И РАСПОРЯЖЕНИЙ

Рабоче-Крестьянского Правительства Белорусской Социалистической Советской Республики.

№ 49 | 31 сьнежня 1925 г. | Аддзел І.

№ 49 | 31 декабря 1925 г. | Отдел I.

## ЗЬМЕСТ

**Пастановы 2 сэсіі ЦИК БССР VII скліканьня.**

Арт. 382. Аб пацьвярджэньні і увядзеньні у дзейнасьць перапрацованага Палажэньня аб судабудаунітцве.

## СОДЕРЖАНИЕ

**Постановления 2-й Сессии ЦИК БССР VII созыва.**

Ст. 382. Об утверждении и введении в действие переработанного Положения о Судоустройстве.

## Пастанова 2-е Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР VII скліканьня.

### Арт. 382. Аб пацьвярджэньні і ўвядзеньні ў дзейнасьць перапрацаванага „Палажэньня аб Судабудаўніцтве“.

2-ая Сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту VII скліканьня пастанаўляе:

1. Падаты на разгляд Сэсіі перапрацаваны проэкт „Палажэньня аб судабудаўніцтве“ пацьвярдзіць і ўвясьці ў дзейнасьць з 1-га лістапада 1925 году.

2. З увядзеньнем у дзейнасьць гэтага „Палажэньня аб Судабудаўніцтве“ траціць сілу „Палажэньне аб судабудаўніцтве, прынятае 2-ю Сэсіяй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту VI-га скліканьня ад 15 ліпеня 1924 году (Зб. Зак. № 2—1924 г. і № 12 арт. 112).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

*А. Чарвякоў.*

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР З. *Чарнушэвіч.*

31 кастрычніка 1925 г.

## Постановление 2-й Сессии Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР VII Созыва.

### Ст. 382. О подтверждении и введении в действие переработанного „Положения о судоустройстве“.

2 ая Сессия Центрального Исполнительного Комитета VII созыва постановляет:

1. Представленный на рассмотрение переработанный проект „Положения о судоустройстве“ подтвердить и ввести в действие с 1 ноября 1925 г.

2. С введением в действие этого „Положения о Судоустройстве“ теряет силу „Положение о Судоустройстве“, принятое 2-й сессией Центрального Исполнительного Комитета VI созыва от 15 июля 1924 г. (Собр. Узак. № 2—1924 г. № 12, ст. 112).

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР

*А. Червяков.*

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР

*Д. Чернушевич.*

31 октября 1925 г.

## Палажэньне аб судабудаўніцтве БССР.

### ПАДЗЕЛ I.

### Глава 1.

### Асноўныя палажэньні.

Арт. 1 Задачамі суда зьяўляюцца:

а) абарона заваёваў пролетарскай рэволюцыі, рабоча-сялянскай ўлады і ўстаноўленага ёю правапарадку;

б) ахова інтарэсаў і правоў працоўных і іх аб'яднаньняў;

в) умацаваньне грамадзка-працоўнае дысцыпліны і солідарнасьці працоўных і іх прававое выхаваньне;

г) ажыцьцяўленьне рэволюцыйнай законнасьці ў асабовых і маемасьных адносінах грамадзян.

Арт. 2. На тэрыторыі БССР дзейнічае наступная адзіная сыстэма судовых установ:

а) народныя суды ў складзе пастаяннага народнага судзьдзі або ў складзе таго самага пастаяннага народнага судзьдзі і дваіх народных засядаталяў;

б) акруговыя суды;

в) вярхоўны суд.

Арт 3. Для разгляду спраў асобых катэгорый, патрабуючых спэцыяльнаго складу або асобага парадку разгляду на тэрыторыі БССР, побач з адзінай сыстэмай судовых установ (арт. 2) дзейнічаюць наступныя спэцыяльныя суды і судова-адміністрацыйныя органы;

а) па справах аб вайсковых праступках—ваенныя трыбуналы.

*Увага:* У асобліва выключных выпадках па пастанове Прэзыдыуму ЦВК БССР разгляду ў ваенных трыбуналах падлягаюць таксама і іншыя праступкі, пагражаючыя дужасьці і магутнасьці Чырвонай Арміі.

б) па справах, злучаных з нарушэньнем законаў аб працы—асобыя працоўныя сэсіі народных судоў;

в) па зямельных справах—зямельныя камісіі, у гэтым ліку і Асобая Колегія Вышэйшага Кантроля па зямельных справах;

## Положение о судоустройстве БССР.

### РАЗДЕЛ I.

### Глава 1.

### Основные положения.

Ст. 1. Задачами Суда являются:

а) ограждение завоеваний пролетарской революции, Рабоче-Крестьянской власти и правопорядка, ею установленного;

б) защита интересов и прав трудящихся и их об'единений;

в) укрепление общественно-трудовой дисциплины и солидарности трудящихся и их правовое воспитание;

г) осуществление революционной законности в личных и имущественных отношениях граждан.

Ст. 2. На территории БССР действует следующая единая система судебных учреждений:

а) Народные суды в составе постоянного народного судьи или в составе того же постоянного Народного Судьи и двух народных заседателей;

б) Окружные Суды;

в) Верховный Суд.

Ст. 3. Для рассмотрения дел особых категорий, требующих специального состава или особого порядка рассмотрения, наряду с единой системой судебных учреждений (ст. 2), действуют на территории БССР следующие специальные Суды и судебно-административные органы;

а) по делам о воинских преступлениях—военные трибуналы;

*Примечание*. В особо исключительных случаях по постановлению Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР рассмотрению в военных трибуналах подлежат также и иные угрожающие крепости и мощности Красной армии преступления.

б) по делам, связанным с нарушением законов о труде—особые Трудовые Сессии Народных Судов;

в) по делам земельным—земельные комиссии, в том числе и Особая Коллегия Высшего Контроля по земельным делам;

г) па справах аб маемасных спрэчках паміж дзяржаўных органаў—Арбітражная Камісія, якая знаходзіцца пры Экономічнай Нарадзе БССР;

д) па справах аб грамадзка-небясьпечных учынках недалеткаў—камісія па справах аб недалетках.

Парадак організаваньня і дзейнасьці памянёных ў гэтым артыкуле судоў, вызначан VII главою IV падзелу гэтага палажэньня.

Арт. 4. Народны судзьдзя, дзеючы адзін або з двума народнымі засядатэлямі, ажыцьцяўляе сваю дзейнасьць у межах вылучанага яму вучастка і адказвае за сваю работу выключна па судзе або перад вышэйшай судовай установай БССР паводле парадку, вызначанага ў гэтым палажэньні.

*Увага:* Акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты наглядаюць за дзейнасьцю народных судзьдзяў, якія знаходзяцца на падпарадкаванай ім тэрыторыі, але ня ўмешваюцца ў іх работу. Аб заўважаных парушэньнях і недахопах яны паведамляюць вышэйшым органам.

Арт. 5. Акруговыя суды распаўсюджваюць сваю дзейнасьць на падпарадкаваную кожнаму з іх тэрыторыю і звыш падсудных ім спраў, наглядаюць за ўсімі дзеючымі на гэтай тэрыторыі судамі, апрача выязных сэсій Вярхоўнага Суда, ваенных трыбуналаў і зямельных камісій.

Арт. 6. Адчыненьне новых акруговых судоў, зачыненьне існуючых, а таксама зьмяненьне іх тэрыторыяльнай падсуднасьці робіцца пастановаю Савету Народных Камісараў.

Арт. 7. Вярхоўнаму Суду БССР належыць:

а) кіраўніцтва ўсёю судоваю практыкаю;

б) разгляд у якасьці суда першай інстанцыі крымінальных і грамадзянскіх спраў, залічаных да падсуднасьці Вярхоўнага Суда;

г) по делам об имущественных спорах между Государственными органами—состоящая при Экономическом Совещании БССР Арбитражная Комиссия;

д) по делам об общественно-опасных действиях, совершаемых несовершеннолетними—Комиссия по делам о несовершеннолетних.

Порядок организации и деятельности судов, указанных в настоящей статье, определены в разделе IV главы VII настоящего Положения.

Ст. 4. Народный Судья, действующий единолично или совместно с двумя народными заседателями, осуществляет свою деятельность в пределах отведенного ему участка и ответственен за свою работу исключительно по суду или перед вышестоящими судебными учреждениями БССР, в порядке, определенном настоящим Положением.

*Примечание.* Окружные и Районные Исполнительные Комитеты наблюдают за деятельностью народных судей, находящихся на подведомственной им территории, но не вмешиваются в их работу. О замеченных нарушениях и недостатках они сообщают вышестоящим органам.

Ст. 5. Окружные суды распространяют свою деятельность на подведомственную каждому из них территорию и сверх дел, им подсудных, имеют надзор за всеми действующими на этой территории судами, кроме выездных сессий Верховного Суда, Военных Трибуналов и Земельных Комиссий.

Ст. 6. Открытие новых окружных судов, закрытие существующих, а равно изменение их территориальной подсудности производится постановлением Совета Народных Комиссаров.

Ст. 7. Верховному Суду БССР принадлежит:

а) руководство всей судебной практикой;

б) рассмотрение в качестве суда первой инстанции уголовных и гражданских дел, отнесенных к подсудности Верховного Суда;

в) разгляд у касацыйным парадку спраў, вырашаных акруговымі судамі і ваеннымі трыбуналамі;

г) запатрабаваньне і разгляд у парадку нагляду спраў любога суда і судова-адміністрацыйнага органа, дзеючых на тэрыторыі Рэспублікі, пералічаных у арт. 2 і 3 гэтага палажэньня, апрача зямельных камісій, Асобай Колегіі Вышэйшага Кантроля па зямельных справах і Арбітражнай Камісіі.

Арт. 8. Для нагляду за выпаўненьнем законаў, непасрэднага назіраньня над папярэднім сьледзтвам, нагляду за дзейнасьцю органаў дазнаньня і падтрыманьня абвінавачаньня на судзе, а таксама для аховы інтарэсаў дзяржавы і працоўных у часе вырашэньня грамадзянскіх спрэчак дзейнічае дзяржаўная пракуратура.

Арт. 9. Для папярэдняга расьсьледваньня падлягаючых судоваму разгляду праступных дзеяньняў і непасрэднага нагляду над правядзеньнем дазнаньня дзейнічаюць пад наглядам прокуратуры сьледчыя.

Арт. 10. Для юрыдычнай дапамогі працоўным і ажыцьцяўленьня судовай абароны гр-н праз асоб, якія ўпаўне адпавядаюць патрабаваньням, неабходным для ўдзелу ў адбыцьці пролетарскарскага правасудзьдзя, пры акруговых судох пад непасрэдным наглядам апошніх і агульным наглядам Народнага Камісарыяту Юстыцыі дзейнічае калегія абаронцаў.

Арт. 11. Для ўчыненьня і заверкі актаў і дагавораў і выпаўненьня іншых прадугледжаных законам дзеяньняў адчыняюцца нотарыяльныя канторы.

Арт. 12. Для зьдзьйсьненьня судовых рашэньняў і вызначэньняў, а таксама для выпаўненьня іншых прадугледжаных законам дзеяньняў пры акруговых судох дзейнічаюць судовыя выпаўнiцелі.

Арт. 13. Усе прыгавары, рашэньні, вызначэньні і судовыя загады ўсіх судовых устаноў Саюзу ССР і ўва-

в) рассмотрение в кассационном порядке дел, решенных Окружными Судами и Военными Трибуналами;

г) истребование и рассмотрение в порядке надзора дел любого суда и судебно - административного органа, действующих на территории Республики, перечисленных в ст. ст. 2 и 3 настоящего Положения за исключением земельных комиссий, Особой Коллегии Высшего Контроля по земельным делам и арбитражной Комиссии.

Ст. 8. Для надзора за соблюдением законов, непосредственного наблюдения за производством предварительного следствия, надзора за деятельностью органов дознания и поддержания обвинения на суде, а равно для охраны интересов государства и трудящихся при разрешении гражданских споров действует Государственная Прокуратура.

Ст. 9. Для предварительного расследования подлежащих судебному рассмотрению преступных деяний и непосредственного надзора за производством дознания действуют под наблюдением Прокуратуры следователи.

Ст. 10. Для оказания трудящимся юридической помощи и осуществления судебной защиты гр-н лицами, вполне отвечающими требованиям, необходимых для участия в отправлении пролетарского правосудия, при окружных судах, под непосредственным наблюдением последних и общим надзором Народного Комиссариата Юстиции, действует коллегия защитников.

Ст. 11. Для совершения и засвидетельствования актов и договоров и выполнения иных предусмотренных законом действий учреждаются нотариальные конторы.

Ст. 12. Для приведения в исполнение судебных решений и определения, а также для выполнения иных предусмотренных законом действий при окружных судах состоят судебные исполнители.

Ст. 13. Все приговоры, решения, определения и судебные приказы всех судебных учреждений Союза

ходзячых у Саюз Рэспублік, а таксама пастановы і патрабаваньні пракуратуры і пацьверджаныя ёю пастановы судовасьледчых органаў належаць зьдзяйсьненьню ўсіх дзеючых на тэрыторыі БССР судовых, сьледчых і адміністрацыйных органаў у межах іх компэтэнцыі.

Арт. 14. Межы компэтэнцыі, дзейнасьць і адказнасьць памянёных вышэй установаў і службовых асоб вызначаюцца адпаведнымі падзеламі і артыкуламі гэтага палажэньня і асобымі ўзаканеньнямі.

Глава II.

## Аб народных судзьдзях.

Арт. 15. За народнага судзьдзю можа быць кожны грамадзянін і грамадзянка БССР, калі яны незьняслаўлены па судзе і адпавядаюць наступным запатрабаваньням:

а) маюць права выбіраць і выбірацца ў саветы;

б) маюць ня менш двохлетняга стажу адказнай палітычнай работы ў рабоча-сялянскіх, грамадзкіх, профэсыянальных або партыйных рабочых організацыях або трохлетняй практычнай работы ў органах савецкай юстыцыі на пасадах ня ніжай народнага сьледчага ці на адпаведных пасадах у адміністрацыйных органах.

*Увага.* Асобы, выключаныя з грамадзкіх і профэсыянальных організацый за ганблівыя ўчынкі ня могуць быць за народных судзьдзяў.

Арт. 16. Народныя судзьдзі выбіраюцца акруговымі выканаўчымі камітэтамі паводле колькасьці вучасткаў народнага суда ў акрузе з кандыдатаў, вылучаемых самімі акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі або прызначаемых акруговымі судамі, і падцьвярджаюцца Народным Камісарыятам Юстыцыі.

Арт. 17. Народныя судзьдзі выбіраюцца на адзін год і могуць пера-

ССР и входящих в Союз Республик, а равно постановления и требования Прокуратуры и подтвержденные Прокуратурой постановления судебно-следственных органов подлежат приведению в исполнение всеми действующими на территории БССР судебными, следственными и административными органами в пределах их компетенции.

Ст. 14. Пределы компетенции, деятельность и ответственность вышеуказанных учреждений и должностных лиц определяются соответствующими разделами и статьями настоящего Положения и особыми Узаконениями.

Глава II.

## О народных судьях.

Ст. 15. Народным Судьей может быть всякий гражданин и гражданка БССР, неопороченные по суду и отвечающие следующим условиям:

а) иметь право избирать и быть избираемым в Советы;

б) иметь не менее 2-х годичного стажа ответственной политической работы в Рабоче-Крестьянских общественных, профессиональных или партийных рабочих организациях или трехлетнего стажа практической работы в органах Советской Юстиции на должностях не ниже Народного следователя или соответствующих должностях в административных органах.

*Примечание.* Лица, исключенные из общественных и профессиональных организаций за порочащие поступки, не могут быть народными судьями.

Ст. 16. Народные судьи избираются окружными исполнительными комитетами по числу участков народного суда в округе из кандидатов, выдвигаемых самими окружными и районными исполнительными комитетами или представляемых окружными судами, и утверждаются Народным Комиссаром Юстиции.

Ст. 17. Народные судьи избираются сроком на один год и могут быть

выбірацца, Адклікаць народнага судзьдзю да пары або перамяшчаць яго ў межах акругі можна выключна па пастанове выбраўшага яго выканаўчага камітэту як па ўласнай ініцыятыве апошняга, гэтак і па прапазыцыі Народнага Камісара Юстыцыі і захадах акруговага суда, але ў першым выпадку неабходна адначаснае падрабязнае паведамленьне прычын адкліканьня акруговаму суду і Народнаму Камісару Юстыцыі. Зьмяшчаць народнага судзьдзю з пасады можна выключна па пастанове суда або у парадку, прадугледжаным артыкуламі гэтага палажэньня.

Арт. 18. Вызначэньне колкасьці вучасткаў народнага суда у акрузе, а таксама граніц вучасткаў і месцанахаджэньня камэры народнага судзьдзі робіцца пастановаю акруговага выканаўчага камітэту, узгодненай з належным акруговым судом і Народным Камісарыятам Юстыцыі.

Арт. 19. Для найбольш поўнага абслугоўваньня ў судовых адносінах усіх нацыянальнасьцяй БССР утвараюцца, паводле пастановы акруговага выканаўчага камітэту, узгодненай з акруговым судом і зацьверджанай, паводле захадаў Народнага Камісарыяту Юстыцыі, Саветам Народнага Камісараў, камэры народных судоў з судаводствам на мове данае нацыянальнасьці.

Арт. 20. Пры кожным вучастковым народным судзе існуе сэкрэтар суда які пацьвярджаецца на пасадзе акруговым судом паводле захадаў народнага судзьдзі. Асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў, зьнеслаўленыя на судзе, або выключаныя з грамадзкіх і прафэсыянальных организацый за ганблівыя ўчынкі і паводзіны, ня могуць займаць пасады сэкратара народнага суда.

Арт. 21. Непасрэдны нагляд за дзейнасьцю народнага судзьдзі належыць адпаведнаму акруговаму суду.

переизбираемы. Отозвание народного судьи до срока или его перемещения в пределах округа могут иметь место исключительно по постановлению избравшего его исполнительного комитета как по собственной инициативе последнего, так и по предложению Народного Комиссара Юстиции и представлению окружного суда, но в первом случае с обязательным одновременным сообщением подробных мотивов отзывания Окружному суду и Народному Комиссару Юстиции. Смещение с должности Народного судьи может иметь место исключительно по суду или в порядке, предусмотренном статьями настоящего Положения.

Ст. 18. Определеление количества участков народного суда в округе, а также границ участков и местонахождения камеры народного судьи производится постановлением окружного исполнительного комитета, согласованным с подлежащим окружным судом и Народным Комиссариатом Юстиции.

Ст. 19. Для наиболее полного обслуживания в судебном отношении всех национальностей БССР образуются по постановлению окружного исполнительного комитета, согласованному с окружным судом и утвержденному по представлению Народного Комиссариата Юстиции Советом Народных Комиссаров, камеры народных судов с постановкой в них судопроизводства на языке данной национальности.

Ст. 20. При каждом участковом народном суде состоит Секретарь суда, утверждаемый в должности окружным судом по представлению народного судьи. Лица, лишенные избирательных прав, опороченные по суду, либо исключенные из общественных и профессиональных организаций за позорящие поступки и поведение, не могут занимать должности секреетаря народного суда.

Ст. 21. Непосредственный надзор за деятельностью народного судьи, принадлежит соответствующему окружному суду.

## ГЛАВА III.

## Аб Народных Засядаталях.

Арт. 22. За народных засядаталяў могуць быць усе працоўныя грамадзяне абодвых полаў, якія пражываюць на тэрыторыі БССР і маюць права выбіраць і выбірацца ў саветы

*Увага.* Ня маюць права быць народнымі засядаталямі особы, зьнеслаўленыя па суўзе, або выключаныя з грамадзкіх і прафэсіянальных організацый пастановамі апошніх за ганьблівыя ўчынкі і паводзіны.

Арт. 23. Кожны народны засядаталь ня можа ўдзельнічаць ў судовых пасяджэньнях больш за 6 дзён у год.

*Увага.* Абмежаваньне удзелу народных засядаталяў 6 днямі ў год не пашыраецца на тыя выпадкі, калі справа слухаецца больш 6-ці дзён.

Арт. 24. Колькасьць народных засядаталяўдля кожнага вучастка народнага суда ўстанаўляецца асобай інструкцыяй Народнага Камісарыяту Юстыцыі.

Арт. 25. Сьпісы народных засядаталяў складаюцца адзін раз ў год к 1 сьнежня. За месяц да гэтага часу ў кожным раёнмым цэнтры асобая камісія пад старшынаваньнем члена раёнага выканаўчага камітэту і ў складзе прадстаўніка раёнага прафэсіянальнага бюро і мясцовага народнага судзьдзі разьмяркоўвае неабходны для народнага суда лік народных засядаталяў і такі-ж лік кандыдатаў да іх па ўсіх установах і прадпрыемствах раёну, сельскіх саветах і разьмешчаных на тэрыторыі раёну вайсковых часьцях.

Арт. 26. Аб колькасьці падлягаючых выбару народных засядаталяў і кандыдатаў камісія паведамляе адпаведныя ўстановы, фабрычна-заводзкія камітэты, сельскія саветы, і вайсковыя часьці, якія складаюць кандыдацкія сьпісы і вывешваюць іх на відавоку. Пасьля сямі дзён з дня вывескі кандыдацкіх сьпісаў

## ГЛАВА III

## О Народных Заседателях.

Ст. 22. Народными заседателями могут быть все трудящиеся граждане обоего пола, проживающие на территории БССР, имеющие право избирать и быть избранными в советы.

*Примечание.* Не имеют права быть народными заседателями лица, опороченные по суду, либо исключенные из общественных и професиональных организаций постановлениями последних за позорящие поступки и поведение

Ст. 23. Каждый народный заседатель не может принимать участия в судебных заседаниях более, чем в продолжение шести дней в году.

*Примечание.* Ограничение участия народных заседателей 6-ю днями в году не распространяется на случаи, когда слушание дела продолжается более 6-ти дней.

Ст. 24. Количество народных заседателей для каждого участка Народного суда устанавливается особой инструкцией, издаваемой Народным Комиссариатом Юстиции.

Ст. 25 Списки народных заседателей составляются один раз в году к 1-му декабря. За месяц до этого срока в каждом районном центре особая комиссия в составе председательствующего члена районного исполнительного комитета, представителя районного профбюро и местного народного судьи производит распределение необходимого для народного суда числа нарзаседателей и такого же числа кандидатов к ним по всем учреждениям и предприятиям района, сельским советам и расположенным на территории района воинским частям.

Ст. 26. О количестве, подлежащих избранию народных заседателей и кандидатов комиссия сообщает соответствующим учреждениям, фабрично-заводским комитетам, сельсоветам и воинским частям, которые и составляют списки кандидатов и вывешивают их на видном месте. По истечении семи дней со дня выве-

выбіраецца на агульных сходах установ, організацый і вайсковых часьцей, а таксама на сельскіх сходах патрэбны лік засядаталяў і кандыдатаў да іх. Усе адводы супроць асобных асоб заяўляюцца на тых самых агульных сходах, якімі і вырашаюцца, пасьля чаго аканчальныя сьпісы засядаталяў і кандыдатаў да іх накіроўваюцца ў раёную камісію.

Арт. 27. Раённая камісія мае права выключыць з сьпісаў народных засядаталяў асоб, якія не адпавядаюць запатрабаваньням, што вымагаюцца ад народных засядаталяў, і замяніць іх такімі кандыдатамі, якія адпавядаюць гэтым запатрабаваньням. Склаўшы затым сьпісы народных засядаталяў на кожны вучастак народнага суда, камісія перадае іх для пацьвярджэньня прэзыдыуму раённага выканаўчага камітэту, які адначасна вырашае ўсе паданыя яму скаргі выключаных грамадзян на неправільнае выключэньне іх з сьпісаў. Зацьверджаныя сьпісы народных засядаталяў, зложаныя ў альфабэтным парадку, накіроўваюцца адпаведным народным судом.

*Увага:* Скаргі на неправільнае выключэньне, паступіўшыя пасьля пацьвярджэньня сьпісаў, не разглядаюцца. Пастановы прэзыдыуму раёнага выканаўчага камітэту па скаргах на неправільнае выключэньне могуць аскарджвацца акруговаму выканаўчаму камітэту. Рашэньні апошняга лічацца аканчальнымі.

Арт. 28. Паводле парадку і срокаў азначаных у арт. арт. 22—25 гэтага палажэньня, складаюцца сьпісы народных засядаталяў і для вучасткаў народнага суда ў акруговых гарадох. У гэтым выпадку сьпісы складаюцца акруговымі камісіямі, у склад якіх уваходзяць: старшыня—член акруговага выканаўчага камітэту, два прадстаўнікі акруговага бюро профэсыянальных саюзаў, акруговы прокурор і прадстаўнік мясцовага акругавага суда або ўпаўнаважаны акруговага суда ў тых акруговых гарадох, дзе няма акруговага суда. Пацьшивания списков производятся на общих собраниях учреждений, организаций и воинских частей, а равно на сельских сходах выборы требуемого числа заседателей и кандидатов к ним. Все отводы против отдельных лиц заявляются на тех же общих собраниях, которыми и разрешаются, после чего окончательные списки заседателей и кандидатов к ним направляются в районную комиссию.

Ст. 27 Районная комиссия вправе исключить из списков народных заседателей лиц, не удовлетворяющих требованиям, пред'являемым к народным заседателям и заменить их соответствующими кандидатами, удовлетворящими этим требованиям. Составив затем списки народных заседателей по каждому участку Народного суда, Комиссия передает их на утверждение в президиум районого исполнительного комитета, который разрешает одновременно и все поданные ему жалобы (исключенных) граждан на исключение их из списков. Утвержденные списки народных заседателей, составленные в алфавитном порядке, направляются соответствующим Народным судам.

*Примечание.* Жалобы на исключение, поступившие после утверждения списков, оставляются без рассмотрения. Постановления президиума районного исполнительного комитета по жалобам на исключение могут быть обжалованы в соответствующий окружной исполнительный комитет, решения которого считаются окончательными.

Ст. 28. Применительно к порядку указанному в ст. ст. 22—25 настоящего положения и ,с соблюдением тех же сроков, составляются списки народных заседателей для участков Народного Суда в окружных городах. Обязанности районных комиссий по составлению списков выполняются окружными комиссиями, в состав которых входят: председатель —член окружного исполнительного комитета, два представителя окружного бюро профессиональных союзов, окружной прокурор и представитель местного суда или уполномоченный

вярджэньне сьпісаў і разгляд скарг на неправільнасьць іх злажэньня выпаўняюцца прэзыдыумам акругова выканаўчага камітэту. Разьмеркаваньне неабходнага для кожнага вучастка народнага суда ў акруговым горадзе ліку народных засядаталяў і, такога-ж ліку кандыдатаў да іх робіцца акруговай камісіяй.

Арт. 29 Народныя засядаталі заклікаюцца народным судзьдзёй для выпаўненьня сваіх судзейскіх абавязкаў па альфабэтнай чарзе. Пасьля таго, як народныя засядаталі прыбудуць у суд, народны судзьдзя абавязан разьясьніць ім іх правы і абавязкі, узяўшы ад кожнага падпіску аб такім разьясненьні і ўрачыстае абяцаньне судзіць сумленна.

Арт. 30. На ўвесь час засяданьня за народнымі засядаталямі захоўваецца іх заработная плата па месцы работы, уключаючы час, патрэбны для праезду ў суд і назад. Асобы, якія палучаюць срэдствы існаваньня ад сельскае працы або хатняга рамясла палучаюць сутачныя, памер і парадак якіх устанаўляецца асобай інструкцыяй Народнага Камісарыяту Юстыцыі, Народнага Камісарыяту Грашовых Спраў і Народнага Камісарыяту Працы, з належных сум, прадугледжаных для гэтай патрэбы раённымі, гарадзкімі і акруговымі бюджэтамі.

Арт. 31. У выпадку хваробы і іншых законных прычын няяўкі народнага засядаталя ў чаргу, гэткая механічна пераносіцца ў канец сьпіса, аб чым народны судзьдзя сваечасна паведамляе засядаталя.

*Увага.* За няяўку бяз уважлівых прычын народны судзьдзя штрафуе народнага засядаталя да 10 руб. і выключае з сьпісаў народных засядаталяў, аб чым паведамляецца выбраўшы яго орган.

окружного суда, в тех окружных городах, где нет окружного суда. Обязанности президиумов районных исполнительных комитетов по утверждению списков и рассмотрению жалоб на неправильности их составления выполняются президиумом окружного исполнительного комитета. Распределение необходимого для каждого участка народного суда в окружном городе числа народных заседателей и такого же числа кандидатов к ним производится окружной комиссией.

Ст. 29. Народные заседатели призываются народным судьей к исполнению судейских обязанностей в порядке алфавитной очереди, при прибытии народных заседателей в народный суд, народный судья обязан раз'яснить им их права и обязанности, отобрав от каждого в таковом раз'яснении подписку и торжественное обещание судить по совести.

Ст. 30. На все время присутствования в качестве заседателей за последними сохраняется их заработная плата по месту работы, включая и время, необходимое для проезда в суд и обратно. Лица, получающие средства существования от сельского труда или домашнего ремесла, получают суточные в размере и порядке устанавливаемых особой инструкцией Народного Комиссариата Юстиции, Народного Комиссариата Финансов и Народного Комиссариата Труда из соответствующих сумм, предусмотрен. для этой цели по районным, городским и окружным бюджетам.

Ст. 31. В случае болезни и других законных причин неявки народного заседателя в очередь таковая механически переносится в конец списка, о чем заседатель своевременно извещается народным судьей.

*Примечание.* За неявку без уважительных причин народный заседатель подвергается народным судьей штрафу до 10 руб. и исключается из списков народных заседателей, о чем извещается орган, его избравший.

## ПАДЗЕЛ II.

### Глава IV.

### Аб акруговым судзе.

Арт. 32 Акруговы суд зьяўляецца:

а) адміністрацыйна - організацыйным цэнтрам для народных судоў, падпарадкаванай яму тэрыторыі;

б) судом першай інстанцыі па справах, падпарадкаваных законам акруговаму суду;

в) органам касацыйна-рэвізыйнага разгляду касацыйных скарг і протэстаў на прыгавары і рашэньні падпарадкаваных яму народных судоў і прыватных скарг на вызначэньні гэтых судоў;

г) органамі непасрэднага нагляду за ўсімі дзеючымі на падпарадкаванай яму тэрыторыі судамі, апрача выязных сэсій Вярхоўнага Суда, военных трыбуналаў і зямельных камісій.

Арт. 33. Акруговы суд дзейнічае ў складзе;

а) пленуму акруговага суда;

б) крымынальнага і грамадзянскага аддзелаў;

в) дысцыплінарнай калегіі.

*Увага*: У выпадку неабходнасьці могуць быць утвораны для разгляду спраў у першай інстанцыі на мясцох выязныя сэсіі акруговага суда.

Арт. 34. Акруговы суд складаецца з старшыні і дваіх яго намесьнікаў: аднаго па крымінальным, другога—па грамадзянскім аддзеле; пастаяных членаў і запрашаемых, у азначаным ніжэй парадку, для ўдзелу ў пасяджэньнях акруговага суда, народных засядаталяў з неабходнай для дзейнасьці гэтага суда і існуючых пры ім устаноў колькасьцю сакратароў і іншых службовых асоб.

Арт. 35. Старшыня і намесьнікі старшыні акруговага суда павінны адпавядаць патрабаваньням, якія вымагаюцца ад народных судзьдзяў (арт. 15 гэтага палажэньня) і апрача гэтага мець ня менш трохлетняга стажу практычнай судовай работы на пасадзе ня ніжэй народнага судзьдзі

## РАЗДЕЛ II.

### Глава IV.

### Об окружном суде.

Ст. 32. Окружный суд является:

а) административно-организационным центром для народных судов подведомственной ему территории;

б) судом первой инстанции по делам, отнесенным законом к ведению окружного суда;

в) органом кассационно-ревизионного рассмотрения кассационных жалоб и протестов на приговоры и решения подведомственных ему народных судов и частных жалоб на определения тех же судов;

г) органом непосредственного надзора за всеми действующими на подведомственной ему территории судами, кроме выездных сессий Верховного суда, военных трибуналов и земельных комиссий.

Ст. 33. Окружный суд действует в составе:

а) пленума окружного суда;

б) уголовного и гражданского отдела;

в) дисциплинарной коллегии.

*Примечание.* При необходимости могут быть организованы для рассмотрения дел в первой инстанции на местах выездные сессии окружного суда.

Ст. 34. Окружный суд состоит из председателя, двух его заместителей —одного по уголовному, другого—по гражданскому отделу, постоянных членов и призываемых в нижеуказанном порядке для участия в заседаниях окружного суда народных заседателей с необходимым для деятельности этого суда и состоящих при нем учреждений количеством секретарей и иных должностных лиц.

Ст. 35. Председатели и заместители председателя окружного суда должны удовлетворять требованиям, пред'явленным к народным судьям (ст. 15 Положения) и сверх того иметь не менее трех лет стажа практической судебной работы по должности не ниже народного судьи.

Членамі акруговага суда могуць быць толькі асобы, якія адпрацавалі ня менш двох год на пасадзе народнага судзьдзі.

*Увага.* Ухіленьні ад гэтага правіла могуць рабіцца толькі па дазваленьні Народнага Камісара Юстыцыі.

Арт. 36. Старшыня, яго намесьнікі і члены акруговага суда выбіраюцца акруговым выканаўчым камітэтам на адзін год і пацьвярджаюцца Народным Камісарам Юстыцыі. Адазваньне ці зьмяшчэньне старшыні, яго намесьнікаў і членаў акруговага суда да пары робіцца пастановаю акруговага выканаўчага камітэту па ўзгадненьні з Народным Камісарыятам Юстыцыі.

*Увага 1.* У тых выпадках, калі дзейнасьць акруговага суда пашыраецца на тэрыторыю болей як аднае акругі, то азначаныя ў гэтым артыкуле судовыя працоўнікі выбіраюцца акруговым выканаўчым камітэтам тае акругі, на тэрыторыі якое знаходзіцца акруговы суд. Парадак пацьвярджэньня застаецца той самы.

*Увага 2.* Акруговыя суды падсправаздачны тым акруговым выканаўчым камітэтам на тэрыторыю якіх пашыраецца іх дзейнасьць.

Арт. 37. Народныя засядаталі для ўдзелу ў судовых пасяджэньнях акруговага суда заклікаюцца па асобым сьпісу з грамадзян, якія маюць ня менш двохлетняга стажу работы ў грамадскіх і профэсіянальных арганізацыях. Сьпісы гэтых грамадзян складаюцца асобай камісіяй таго акруговага гораду, у якім знаходзіцца акруговы суд і дзейнічае пад старшынаваньнем члена акруговага выканаўчага камітэту і ў складзе дваіх прадстаўнікоў акруговага профэсыянальнага бюро, члена акруговага суда і акруговага прокурора. Зложаныя камісіяў сьпісы пацьвярджаюцца акруговым выканаўчым камітэтам.

Членами окружного суда могут быть только лица, проработавшие не менее двух лет в должности народного судьи.

*Примечание.* Отступления от этого правила могут иметь место только с разрешения Народного Комиссариата Юстиции.

Ст. 36. Председатель, его заместители и члены Окружного суда избираются окружным исполнительным комитетом сроком на один год и утверждаются Народным Комиссаром Юстиции. Отозвание или смещение председателя, заместителей его или членов окружного суда до срока производится постановлением окружного исполнительного комитета по согласованию с Народным Комиссариатом Юстиции.

*Примечание 1.* В тех случаях, когда деятельность Окружного суда распространяются на территорию более чем одного округа, избрание указанных в настоящей статье судебных работников производится окружным исполнительным комитетом, на территории которого находится Окружный суд. Порядок утверждения остается тот-же.

*Примечание 2.* Окружные суды под'отчетны тем окружным исполнительным комитетам, на территорию которых распространяется их деятельность.

Ст. 37. Народные заседатели для участия в судебных заседаниях Окружного Суда призываются по особому списку из граждан, имеющих не менее двухлетнего стажа работы в общественных и профессиональных организациях. Списки этих граждан составляются особой комиссией, состоящей в том окружном городе, где находится окружный суд и действующей в составе Председательствующего — члена Окружного Исполнительного Комитета, двух представителей Окружного Профбюро, члена Окружного Суда и Окружного Прокурора. Составленные Комиссией списки утверждаются Окружным Исполнительным Комитетом.

Арт. 38. Народныя засядаталі акруговага суда (арт. 37) выбіраюцца ў колькасьці, вызначанай акруговым судом на ўвесь год. Патрабаваньні, зьмешчаныя ў арт. арт. 22, 23, 29, 30 і 31 гэтага палажэньня і ўвагах да іх, маюць сілу і ў адносінах да засядаталяў акруговага суда.

*Увага 1.* Для ўдзелу ў судовых пасяджэньнях выязных сэсій акруговага суда, складаюцца асобыя сьпісы народных засядаталяў паводле арт. 37 гэтага палажэньня.

*Увага 2.* Для ўдзелу ў судовых пасяджэньнях грамадзянскага аддзяленьня акруговага суда могуць заклікацца ў якасьці народных засядаталяў, народныя судзьдзі паводле чаргі, устаноўленай акруговым судом.

Арт. 39. Сакратары акруговага суда назначаюцца і звальняюцца старшынёю акруговага суда.

Арт. 40. Старшыня акруговага суда павінен:

а) наглядаць за сваечасным і адпаведным выпаўненьнем патрабаваньняў закону, складаньнем сьпісаў народных засядаталяў, складаць і падаваць справаздачы аб народных судох акругаў акруговаму суду і Народнаму Камісарыяту Юстыцыі, наглядаць за дзейнасьцю канцылярыі і складаньнем справаздач аб акруговым судзе і знасіцца па справах суда з Народным Камісарыятам Юстыцыі і іншымі ведамствамі;

б) склікаць пленарныя пасяджэньні акруговага суда як па сваёй ініцыятыве, гэтак і па прапазыцыі аднаго з членаў акруговага суда, старшынаваць на такіх пасяджэньнях, ставіць пытаньні і рабіць папярэдні разгляд матэрыялаў, якія падаюцца на абмеркаваньне пленуму ў межах яго компэтэнцыі, у гэтым ліку падгатаўляць матэрыялы, якія дачыняюцца дысцыплінарнай адказнасьці народных судзьдзяў, сьледчых і іншых судовых і службовых асоб.

Арт. 41. Пленум акруговага суда складаецца з усіх наличных у даны момант членаў акруговага суда, але

Ст. 38. Народные заседатели Окружного Суда (ст 37) избираются в количестве, определенном Окружным судом на весь год. Требования, изложенные в ст. ст. 22, 23, 29, 30 и 31 и примечаниях к ним настоящего положения, имеют силу и в отношении заседателей Окружного суда.

*Примечание 1.* Для участия в судебных заседаниях выездных сессий Окружного Суда, составляются особые списки народных заседателей в порядке ст. 37 настоящего Положения.

*Примечание 2.* Для участия в судебных заседаниях Гражданского отделения Окружного суда могут быть привлекаемы в качестве Народных заседателей народные судьи по установленной между ними Окружным судом очереди.

Ст. 39. Секретари Окружного суда назначаются и увольняются Председателем Окружного суда.

Ст. 40. К ведению Председателя Окружного суда относится:

а) наблюдение за своевременным и соответствующим требованием закона, составлением списков народных заседателей, составление и представление отчетности по народным судам округов, Окружному суду и Народному Комиссариату Юстиции, наблюдение за деятельностью канцелярии и составлением отчетности по окружному суду и все отношения по делам суда с Народным Комиссариатом Юстиции Белоруссии и другими ведомствами;

б) созыв пленарных заседаний Окружного суда, как по своей инициативе, так и по предложению одного из членов Окружного суда, председательствование в таковых, постановка вопросов, и предварительный просмотр материалов, вносимых на обсуждение пленума в пределах его ведения, в том числе подготовка материалов, касающихся дисциплинарной ответственности Народных судей, следователей и иных судебных должностных лиц.

Ст. 41. Пленум Окружного суда составляется из всех наличных в данный момент членов окружного суда

ў кожным выпадку ня менш палавіны ўсяго яго складу, з абавязковым удзелам акруговага прокурора або яго памоцніка.

Арт. 42. Пленуму акруговага суда належыць:

а) разьмеркаваньне членаў акруговага суда па аддзяленьнях, а таксама хадайнічаньне перад акруговым выканаўчым Камітэтам і Народным Камісарыятам Юстыцыі аб павялічэньні агульнага ліку членаў акруговага суда;

б) выбары дысцыплінарнае колегіі;

